Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-10-23



# Зіхоткае святла двайной зоркі

Кніга аднаго з мэтраў айчыннага літаратуразнаўства Міхася Тычыны "Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння" пабачыла свет менавіта тады, калі павінна была пабачыць, — у юбілейны для нашых класікаў год, у час, калі ў іх адрас у самых розных аўдыторыях зацікаўленых людзей, ад настаўнікаў да пісьменнікаў, гучаць высакамоўныя словы кшталту "нацыянальныя геніі", "прарокі", "творчыя і духоўныя арыенціры", "узоры для пераймання" і інш. Але і іх, гэтых прывычных высакамоўных слоў, здаецца, ужо як бы і не хапае — хочацца новых вызначэнняў і абагульненняў, новых сэнсаў.

Манаграфія М.Тычыны яскрава і каштоўная навізной погляду на творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа, у аснове якога пакладзены ідэі параўнальна-гістарычнага метаду і тыпалагічнага падыходу да праблемы вызначэння месца і ролі літаратурнай класікі ў нацыянальнай і сусветнай літаратуры. А гэты новы погляд у сваю чаргу дазволіў аўтару генераваць мноства новых і ў перспектыве ўстойлівых ідэй і высноў, крытычна прачытаць досвед купала- і коласазнаўства ўсяго мінулага стагоддзя (тут навукоўцам зроблена без перабольшання каласальная праца!), засяродзіцца на многіх важных асобных пытаннях, напрыклад, феномене двайной зоркі на небасхіле беларускай літаратуры ці творчых сувязях нашых класікаў з іншымі нацыянальнымі літаратурамі, акрэсліць кірункі ў вывучэнні творчасці Купалы і Коласа ў найбліжэйшай будучыні.

Сам жа аўтар свае задачы вызначае наступным чынам: сістэматызаваць і пракаменціраваць зробленае родапачынальнікамі новай беларускай літаратуры ва ўстанаўленні творчых сувязей з польскай і рускай класікай, а пры дапамозе іх пасрэдніцтва і з еўрапейскімі літаратурамі; выявіць "пункты росту" ў мастацка-эстэтычных пошуках Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія істотна паўплывалі на паглыбленне творчых зносін з польскай і рускай класікай; паказаць значэнне ідэйнага і мастацкага вопыту польскіх і рускіх пісьменнікаў у працэсе абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і эстэтычнага станаўлення беларускай літаратуры; устанавіць факты творчай палемікі Купалы і Коласа з літаратурнымі папярэднікамі і іх месца ў працэсе стварэння мастацкіх шэдэўраў; адзначыць асноўныя прыкметы эвалюцыі мастацкага мыслення Янкі Купалы і Якуба Коласа ў творчасці апошніх дзесяцігоддзяў жыцця. Пры гэтым навуковец лічыць неабходным заўважыць, што ён "зыходзіць з уяўлення, што класічная польская і руская літаратуры адыгралі надзвычайную ролю ў ідэйным і мастацкім станаўленні Янкі Купалы і Якуба Коласа, а ў выніку садзейнічалі працэсу актывізацыі нацыянальнага самаўсведамлення беларусаў, фарміравання класічнага стылю і беларускай літаратурнай мовы". А таксама "абапіраецца на агульную філасофскую метадалогію, заснаваную на ідэі адзінства грамадска-гістарычнага развіцця чалавецтва, на думцы аб непазбежнасці і плённасці культурных і літаратурных узаемасувязей паміж народамі". Несумненна, што ў кнізе ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве зроблены такі настойлівы акцэнт менавіта на параўнальна-гістарычным аналізе пры разглядзе пытанняў фарміравання творчых асоб Купалы і Коласа, па сутнасці, пераасэнсоўваюцца ранейшыя ўяўленні аб маштабах і ступені ўплыву польскай і рускай літаратур на нашых класікаў.

У першым раздзеле манаграфіі "Пачатак усіх пачаткаў" падрабязна аналізуецца ўвесь няпросты культурна-гістарычны бэкграўнд, на якім гадаваліся і рабілі свае першыя крокі ў літаратуры нашы класікі. Аўтар прыходзіць да высновы, што ўжо ў творчасці Францішка Багушэвіча нацыянальнае адраджэнне беларусаў пачало губляць рысы стыхійнасці, паступова перарастаючы ў імкненне мільёнаў да свабоды і незалежнасці. Але менавіта ў паэзіі Купалы і Коласа гэты гістарычны працэс стаў прадметам татальнага і паслядоўнага мастацкага адлюстравання.

Своеасаблівай "кнігай у кнізе" можна лічыць другі раздзел "Феномен "літаратурнай пары". Там ёсць свая "лірычна-астранамічная" запеўка, напрыклад, з такімі ўводзінамі ў беларускую міфалогію: "Беларускі этыялагічны міф сцвярджае, што зоркі на небасхіле — гэта нябесныя свечкі, якія запальваюць анёлы тады, калі нараджаецца новы чалавек. Народная загадка пры гэтым удакладняе на свой лад: "Свечак многа гарыць, а ніводнай не патушыць". Адказ: "зоркі на небе". Да згаданага шэрагу належыць і павер'е, што колькасць зорак на небе адпавядае колькасці жывых людзей на зямлі. Калі чалавек памірае, анёлы гасяць яго свечку. Прычым калі памірае грэшнік, яго зорка адразу падае долу (адсюль — знічкі, інакш кажучы, душы нябожчыкаў, што памерлі няхрышчанымі і цяпер лятуць у пекла, і, каб іх выратаваць, трэба іх у часе палёту "перахрысціць", сказаўшы хутка: "Ва імя Айца й Сына // Даю табе імя: // Калі пан, будзеш Ян, // Калі панна, будзеш Ганна")... Зорка ж праведніка ляціць проста ўгару. Зоркі добрых людзей гараць ясна, зіхотка, а зоркі грэшнікаў ледзьве свецяць, а то і не свецяць зусім. Пра апошніх казалі, што "ён шэльма з-пад цёмнае зоркі". Прысутнічаюць у гэтай запеўцы і пачаткі астраноміі з адсылкай да ўласна беларускага небасхіла: "У сузор'і Вялікай Мядзведзіцы ёсць зорка 4-й велічыні Алькор і яе спадарожнік Міцар — у Старажытнай Спарце лічылася, што вастрыню зроку можна вымераць па тым, ці бачна гэтая двайная зорка няўзброеным вокам. Сучасныя беларусы ў большасці сваёй выдатна бачаць двайную зорку Купалы і Коласа, і вастрыня іх зроку з часам толькі завастраецца. Двайная зорка Купала — Колас ужо другое стагоддзе ззяе ў памяці і свядомасці беларусаў як пуцяводная, і святло яе чым далей, тым ярчэй разгараецца на беларускім небасхіле".

Аўтар лёгка знаходзіць аналагі беларускай двайной зоркі на карце сусветнага літаратурнага неба. У нямецкай літаратуры гэта Гётэ і Шылер, у французскай — Бальзак і Стэндаль, у польскай — Міцкевіч і Славацкі, у рускай — Пушкін і Гогаль, ва ўкраінскай — Шаўчэнка і Франко... Назіранне ж за беларускім літаратурным небасхілам дазваляе навукоўцу выявіць узаемадапаўняльныя парныя імёны і сярод наступнікаў нашых класікаў: Максім Гарэцкі — Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка — Язэп Пушча, Іван Мележ — Іван Шамякін, Васіль Быкаў — Алесь Адамовіч, Ніл Гілевіч — Рыгор Барадулін, Вячаслаў Адамчык — Іван Чыгрынаў, Міхась Стральцоў — Віктар Казько, Яўгенія Янішчыц — Алесь Разанаў і г.д.

Выкарыстоўваючы псіхалагічныя характарыстыкі творчага тыпу ў адносінах да Янкі Купалы і Якуба Коласа, аўтар адзначае, што ў Купалы, несумненна, пераважае дыянісійскі (трагічна-аргіястычны, жыццёва-ап'яняльны) пачатак, у Коласа ж яго процілегласць — пачатак апаланічны (аптымістычна-жыццярадасны, лагічна-ўраўнаважаны, прыгожы). Купала, паводле класіфікацыі К.Юнга, — экстраверт, Колас — інтраверт, а паводле вядомых чатырох тыпаў тэмпераменту, Купала — халерык (прынамсі, такія азначэнні сустракаюцца ва ўспамінах яго сучаснікаў), выбухова-нервовы, напружана-раптоўны, Колас — флегматык, спакойна-задумены, мэтанакіравана-паслядоўны.

Параўнальна-гістарычная канкрэтыка разгортваецца і ў гэтым, і ў іншых раздзелах кнігі праз аналіз першых крытычных водгукаў сучаснікаў Купалы і Коласа (А.Пагодзіна, У.Самойлы, М.Горкага, С.Палуяна і іншых) на іх творчасць, фрагментаў перапіскі будучых класікаў з рознымі дзеячамі культуры, іх першых літаратурных проб, у прыватнасці польскамоўных вершаў Янкі Купалы і рускамоўных вершаў Якуба Коласа. Вельмі істотнымі падаюцца наступныя назіранні і высновы даследчыка: "Класікі беларускай літаратуры, Янка Купала і Якуб Колас, якія нарадзіліся, у адрозненне ад Ф.Багушэвіча, "у сваю эпоху", у пачатку мінулага стагоддзя былі маладымі 20—30-гадовымі людзьмі, пра якіх мы заўсёды гаворым як пра родапачынальнікаў нашай літаратуры, актыўных удзельнікаў гістарычнага працэсу дзяржавабудаўніцтва і нацыятворчасці. Між тым і яны да таго моманту, як натрапілі на яго кнігі "Дудка беларуская" і "Смык беларускі", адчувалі сябе "на ростанях" (Коласава назва трылогіі невыпадковая) і ведалі, што выбіраюць не толькі за сябе, але і за ўсіх, хто прыйдзе ў жыццё і ў літаратуру пазней. "За "маладнякоўцаў" і "ўзвышаўцаў", за "забітае пакаленне" і "філалагічнае пакаленне", за "дзяцей вайны" і за "дзяцей дэмаграфічнага крызісу", за "пакаленне ікс" і "камп'ютарнае пакаленне".

Сваёй кульмінацыі думка даследчыка дасягае ў апошнім раздзеле "Эстэтычныя асновы дзяржаўна-культурнага будаўніцтва", дзе аўтар выступае ў якасці тактоўнага і ўважлівага мадэратара дыялогу Купалы і Коласа з сучаснасцю і наогул з так званым беларускім міфам у сусветнай гісторыі народаў. Працытуем у гэтай сувязі, здаецца, асабліва важнае: "Па сутнасці, у эпоху Купалы і Коласа адбылося адкрыццё цэлага народа, які заявіў аб сабе на пераломе стагоддзяў і рашуча ўзышоў на арэну еўрапейскай гісторыі. Усё гэта рабілася насуперак несправыльным акалічнасцям, скепсісу тых, хто спачуваў беларусам, малавер'ю саміх тубыльцаў, малалікасці творчай інтэлігенцыі. Народ, які, паводле існуючых мерак, называлі "малым", "сялянскім", "негістарычным", "жаночым", "рахманым", "лімітрофам", раптам даў свету Янку Купалу свайго Прарока, Майсея". І далей: "У семантычным полі тысячагадовай беларускай гісторыі літаратура ХХ стагоддзя фармальна займае ўсяго дзясятую частку. Аднак несумненнае яе лёсавызначальнае значэнне ў працэсе нацыя- і дзяржаватварэння. Калі ўжыць катэгорыю адсутнасці і ўявіць цяжка ўявімае, а менавіта што ў нас не было Янкі Купалы і Якуба Коласа, толькі іх дваіх, то можна ўпэўнена сказаць, што не было б ні Рэспублікі Беларусь, ні нас саміх. На карце свету, на месцы, дзе знаходзілася вядомае Галоўнае Балота Еўропы, з'явіўся б надпіс: "Тут некалі была Беларусь" (назва верша Максіма Танка, напісаная ў апошнія гады жыцця, калі паэт быў моцна ўстрывожаны зменамі часоў перабудовы). Наша культура — культура Слова, культура Кнігі. Літаратура ў нас нешта большае, чым толькі літаратура, а пісьменнік, і раней, калі літаратура была "нашым усім", і цяпер, калі літаратура апынулася на абочыне грамадскай зацікаўленасці, уяўляе сабою нешта большае, чым проста пісьменнік, інакш кажучы, той, хто спрабуе быць усяго толькі "летапісцам беларускага грамадства" і не прэтэндуе на ролю медыума, прарока, апостала нацыі. Наша літаратура не толькі мае свой лёс, але і сама стала лёсам, бо вызначыла беларускі шлях у цывілізаваны свет, павяла беларусаў "шляхам жыцця" (назва лепшай паэтычнай кнігі Янкі Купалы ў гэтым выпадку сімвалічная), а ў Якуба Коласа ў гэтым выпадку размова можа ісці аб "філасофіі жыцця". Такім чынам, значэнне беларускай літаратуры ХХ стагоддзя і асабліва яе класічнага перыяду, калі тварылі Купала і Колас, больш шырокае, чым толькі быць падмуркам станаўлення беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі".

Міхась Тычына неадночы згадвае ў сваёй кнізе даўні афарызм: "Эстэтыка — гэта этыка будучага", а нацыянальную літаратуру называе лірычным праектам Беларусі ва ўсіх існуючых сучасных вымярэннях. Гэта невыпадкова. І афарызм гэты няпросты для разумення. Але, відавочна, ёсць аб'ектыўныя гістарычныя законы, паводле якіх эстэтыка з цягам часу ператвараецца ў этыку, ідэальнае становіцца штодзённым, лірычнае — побытавым і прывычным. Для асобнага чалавека і для цэлай нацыі. Таму ўрэшце і кніга называецца "Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння". Таму і сёння для беларусаў паранейшаму зіхаціць-пульсуе святло двайной зоркі Купала — Колас. Можна праверыць і зрок, і пульс.

**Мікола ЧЭМЕР.**
gilevitch@ng-press.by




**М.А.Тычына. Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння. — Мінск, "Беларуская навука", 2012.**

**Рэдакцыя газеты "Настаўніцкая газета"**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады рэдактара літаратурнага (карэктара).**

**Патрабаванні да прэтэндэнта:**
- веданне беларускай мовы; - карыстальнік ПК; - камунікабельнасць;
Вопыт работы вітаецца.
Рэзюмэ дасылайце на адрас: info@nastgaz.by.

**Тэлефон для даведак: 287-16-70.**

## Прагноз надвор'я

Сёння днём па Беларусі чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Месцамі невялікія дажджы. Вецер паўночны 2—7 м/с. Максімальная тэмпература паветра +6 — +11°С, па Брэсцкай вобласці ў асобных раёнах да +13°С.

У наступныя двое сутак па краіне чакаецца воблачна з праясненнямі.

Паступовае паніжэнне тэмпературы паветра.

24.10 ноччу па ўсходзе, днём у асобных раёнах невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі туман, слабы галалёд. Вецер заходняй чвэрці 4—9 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад -3°С па поўначы да +5°С па паўднёвым усходзе, максімальная днём +3 — +10°С.

25.10 ноччу па паўночным захадзе, днём на большай частцы тэрыторыі рэспублікі кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман, галалёд. Вецер паўднёва-заходні 4—9 м/с, раніцай і днём парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу -3 — +4°С, максімальная днём ад +3°С па поўначы да +10°С па поўдні краіны.

**Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.**

ISSN 1994-9146
9771994914000 12129
**Галоўны рэдактар Вадзім Кнышаў**

Мікола Чэмер. Зіхоткае святло двайной зоркі